# Іх імёнамі названыя…

«…Люди земли!
Мечту пронесите через года
и жизнью наполните…
Но о тех, кто уже не придет никогда, -
Заклинаю – помните!»

Роберт Рождественский. 1962 год



**Белуш Міхаіл Андрэевіч** нарадзіўся 27 лістапада 1927 года ў вёсцы Руда Ліпічанская Лідскага павета Віленскай губерні (цяпер Мастоўскі раён Гродзенскай вобласці). У гонар яго названая вуліца ў нашым гарадскім пасёлку Карэлічы.

Пра Міхаіла Андрэевіча Белуша захавалася вельмі мала біяграфічных дадзеных і звестак аб яго партызанскай дзейнасці. У час нямецка-фашысцкай акупацыі ў атрадзе "Кастрычнік" партызанскай брыгады "Першамайская" Міхаіл Белуш быў самым маладым. Давяралі яму заданні вельмі адказныя і складаныя. Міхаіл Белуш за кароткі час асвоіў падрыўную справу і, нягледзячы на тое, што партызаны і камандаванне яго залішне апекавалі, што крыўдзіла юнака, Міхаіл настойваў на дазволе ісці на баявыя заданні па падрыву варожых эшалонаў. З цягам часу камандаванню прыйшлося пагадзіцца з гэтым. Самы першы спушчаны пад адхон эшалон ледзь не каштаваў Міхаілу жыцця. Таварышы, якія былі з ім на заданні, канкрэтна прааналізавалі сітуацыю, аднак ўсе моманты прадугледзець не ўдалося. Баявым сябрам сур'ёзна прыйшлося пахваляваўцца за Міхаіла. З ўзніклай

складанай сітуацыяй юнак справіўся паспяхова і таварышы віншавалі яго з першай удалай баявой аперацыяй.

Свой першы баявы выхад на заданне Міхаіл запомніць, што будзе дапамагаць яму ў будучыні весці падрыўную дзейнасць. Восем спушчаных пад адхон варожых эшалонаў было на рахунку Міхаіла, а таксама мноства дарожных мастоў і тэлеграфных ліній.

Шмат разоў даводзілася Міхаілу хадзіць у населеныя пункты на разведку, бо яго ўзрост не заўсёды прыцягваў увагу немцаў і паліцаяў. Тактыка гэта, ў большасці выпадкаў, спрацоўвала паспяхова. Міхаіл хадзіў на разведку ў горад Навагрудак, мястэчка Карэлічы, гарадскі пасёлак Мір і іншыя населеныя пункты, дзе размяшчаліся варожыя гарнізоны. Пры правядзенні разведкі бывала ўсякае: і кур'ёзнае, і небяспечнае. Міхаілу заўсёды ўдавалася паспяхова абыгрываць сітуацыю і вяртацца ў атрад пасля выканання баявога задання.

Свой апошні бессмяротны подзвіг Міхаіл Белуш здзейсніў 16 чэрвеня 1944 года пры разгроме варожага гарнізона ў вёсцы Купіск Навагрудскага раёна. Калі пачалося наступленне партызан на ўмацаванні ворага, з дота па ім пачаў страляць кулямёт, агонь якога прымусіў залегчы. Наступ далей не мог працягвацца, трэба было прымусіць замаўчаць кулямёт. Міхаіл Белуш апынуўся ў абстаноўцы магчымага знішчэння кропкі праціўніка, папоўз бліжэй да доту і кінуў гранату. Агнявая кропка на час змоўкла і партызаны падняліся ў атаку, аднак шквал кулямётнага агню спыніў іх зноў. Міхаіл бачыў, як падалі баявыя таварышы, чуў стогны параненых. У гэты час ён прыняў апошняе ў сваім жыцці рашэнне і сваім целам закрыў амбразуру дота.

На імгненне быццам спынілася жыццё, так гэты гераічны ўчынак маладога юнака падзейнічаў на ўсё наваколле, і толькі праз імгненне аднавілася атака партызан, якую ўжо нішто не магло спыніць. Перастала біцца сэрца маладога юнака, якому ў той час было ўсяго толькі 16 год. Партызаны з ушанаваннем развіталіся і пахавалі юнака-героя на вясковых могілках.

Светлая памяць пра Міхаіла Белуша захавалася ў назвах вуліц у гарадах Гродна, Навагрудку, Мастах, Дзятлаве і гарадскім пасёлку Карэлічы. Подзвіг Міхаіла Белуша адзначаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны першай ступені.

Пасля заканчэння вайны астанкі Міхаіла Белуша былі перанесены ў брацкую магілу ў гарадскім пасёлку Карэлічы. На месцы гібелі юнака ў вёсцы Купіск устанавілі абеліск, а на радзіме героя ў вёсцы Руда Ліпічанская ў 1976 годзе была ўстаноўлена стэла.



***Вуліца Міхаіла Белуша ў гарадскім пасёлку Карэлічы. 2016 год***

**Заўвага:** Асобныя факты ўзяты з успамінаў партызан у 80-90 гады XX стагоддзя.

Выкарыстаная літаратура:

*Беларуская энцыклапедыя: Рэдкал. Г.П.Пашкоў і інш. Мінск Бел.Эн. 1996-2004 гг. Т.3. с.82

*Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Навагрудскага раёна. Минск. Беларусь. 1996 г. с.319-320

ВЕТЭРАН ПРАЦЫ, КРАЯЗНАЎЦА Б.К. НАВІЦКІ